Навукова-метадычная ўстанова
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Аб’ект аўтарскага права
УДК 373+94 (476) (043)

**БІТЧАНКА**
**Сяргей Міхайлавіч**

# ЭВАЛЮЦЫЯ СТВАРЭННЯ ШКОЛЬНАЙ ВУЧЭБНАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук
па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка,
гісторыя педагогікі і адукацыі

Мінск, 2023

Работа выканана ў дзяржаўнай установе адукацыі
«Акадэмія паслядыпломнай адукацыі»

Навуковы кіраўнік: **Марзалюк Ігар Аляксандравіч,**
доктар гістарычных навук, прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Афіцыйныя апаненты: **Снапкова Алена Іванаўна,**
доктар педагагічных навук, прафесар, загадчык кафедры педагогікі ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова»

**Паноў Сяргей Веніямінавіч,**
кандыдат педагагічных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі пачатковай адукацыі навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Апаніруючая арганізацыя: установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава»

Абарона адбудзецца 23 чэрвеня 2023 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.23.01 пры навукова-метадычнай установе «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь: 220004, г. Мінск, вул. Караля, 16, аўд. 301, e-mail: info@adu.by; тэлефон вучонага сакратара +375 (17) 229-19-24.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Аўтарэферат разасланы 23 мая 2023 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт З.С. Курбыка

# УВОДЗІНЫ

На сучасным этапе развіцця беларускага грамадства неабходнай умовай для ўмацавання нацыянальнай бяспекі і забеспячэння ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь з'яўляецца фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму, гістарычнай памяці і нацыянальнай самасвядомасці вучняў на аснове дзяржаўнай ідэалогіі. Адным з найважнейшых фактараў іх фарміравання і замацавання з'яўляюцца школьная гістарычная адукацыя і ідэалагічна верыфікаваны падручнік па роднай гісторыі. Захаванне гістарычнай памяці з'яўляецца неад'емнай часткай палітыкі дзяржавы, накіраванай на папярэджанне скажэння ідэнтыфікацыйнай гістарычнай асновы шляхам стварэння механізма пераемнасці ў грамадскай свядомасці найважнейшых падзей, з'яў, працэсаў гісторыі, дзейнасці выдатных асоб.

Актуальнасць даследавання абумоўлена мэтазгоднасцю ажыццяўлення гістарычна рэтраспектыўнага аналізу працэсу стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. з пункту гледжання пераемнасці з сучаснай дзяржаўнай гістарычнай палітыкай, тэорыяй і практыкай стварэння падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі. У педагагічнай навуцы эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. не з'ўлялася прадметам комплекснага даследавання, што актуалізавана сучасным этапам мадэрнізацыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Даследаванне абапіраецца на палажэнні аб эвалюцыйным развіцці асветы і педагагічнай думкі Беларусі XIX – пачатку XX ст. (Е.Г. Андрэева, В.С. Болбас, Э.К. Дарашэвіч, В.А. Капранава, М.С. Мяцельскі, С.В. Снапкоўская, П.С. Сонцаў); аб заканамернасцях фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, беларускай адукацыі і культуры (Л.П. Бушчык, А.А. Грымаць, У.Ф. Ісаенка, У.Г. Карцоў, М.П. Касцюк, М.А. Лазарук, М.Ф. Піліпенка, М.М. Улашчык); аб канцэптуалізацыі ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі (М.В. Біч, В.П. Грыцкевіч, М.Д. Далбілаў, А.А. Каваленя, Д.У. Караў, А.Г. Каханоўскі, А. Латышонак, Р. Ліндн эр, В.М. Лухверчык, В.У. Ляхоўскі, І.А. Марзалюк, В.Л. Насевіч, А.М. Нечухрын, П.Ц. Петрыкаў, Р. Радзік, А.Ф. Смалянчук, М.С. Сташкевіч, А.І. Цвікевіч); аб фарміраванні гістарычнай памяці ў вучняў праз дыдактычнае канструяванне і вывучэнне зместу вучэбнага матэрыялу па айчыннай гісторыі (Я.Я. Вяземскі, Л.М. Мазур, М.Л. Мыслівец, С.В. Паноў, Л.П. Рэпіна, М.Т. Студзянікін).

У даследаванні выкарыстаны дакументальныя крыніцы Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва (г. Масква), Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва (г. Санкт-Пецярбург), Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы (г. Вільня), Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (г. Мінск, г. Гродна), Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (г. Мінск), архіва рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (г. Мінск), аддзела рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта (г. Вільня), Фундаментальнай бібліятэкі імя імператрыцы Марыі Фёдараўны Расійскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя А.І. Герцэна (г. Санкт-Пецярбург), Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі (г. Масква).

Міністэрствам народнай асветы Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. гісторыя Беларусі не вылучалася як самастойны вучэбны прадмет, а была ўключана ў агульны курс гісторыі Расіі і пад азначэннем «гісторыя Заходняй Русі» стала часткай зместавага напаўнення падручнікаў «Рускай гісторыі». Паступовыя змены ў адлюстраванні гісторыі Беларусі ў школьнай вучэбнай літаратуры Расійскай імперыі падаюцца як фарміраванне вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі.

Вобразы гістарычнага мінулага Беларусі, прадстаўленыя ў школьнай вучэбнай літаратуры, канструяваліся ў адпаведнасці з дзяржаўнай палітыкай у галіне школьнай гістарычнай адукацыі, нарматыўна-метадычнымі патрабаваннямі Міністэрства народнай асветы, а таксама згодна з пазіцыяй прадстаўнікоў акадэмічнай гісторыі і навукова-педагагічнага супольніцтва Расійскай імперыі, у тым ліку і гісторыкаў-педагогаў беларускіх губерняў.

Праблематыка гісторыка-педагагічнага даследавання вызначаецца праз супярэчнасць паміж назапашаным вопытам дзяржаўна-ідэалагічнага рэгулявання, вучэбна-метадычнага забеспячэння працэсу стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. і адсутнасцю яго комплекснага сістэмнага аналізу, неабходнага як для эфектыўнага ажыццяўлення дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь, так і для цэласнага асэнсавання сучаснага працэсу эвалюцыі школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі. Гэта абумовіла выбар тэмы нашага даследавання «Эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.».

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі.** Дысертацыйнае даследаванне выканана на кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» ў кантэксце падпраграмы «Гісторыя і культура» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гады «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства».

**Мэта, задачы, аб'ект і прадмет даследавання.**

**Мэта даследавання:** выяўленне эвалюцыі стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

**Задачы даследавання:**

**1.** Раскрыць тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання эвалюцыі школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі.

**2.** Сканструяваць гісторыка-педагагічную мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

**3.** Выявіць канцэптуальна-ідэалагічныя асновы гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі і поглядах педагогаў наконт выхаваўчай ролі гісторыі ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці вучняў.

**4.** Вызначыць асаблівасці дыдактычнага канструявання структуры вучэбных тэкстаў і эвалюцыю вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі ў зместавым напаўненні школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбных праграм.

**5.** Ахарактарызаваць навукова-педагагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі і вучэбна-метадычныя аспекты яе выкарыстання ў адукацыйным працэсе ў беларускіх губернях Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

**Аб'ект даследавання:** школьная вучэбная літаратура па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

**Прадмет даследавання:** эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

**Навуковая навізна.** У даследаванні сутнасна раскрыты дзяржаўна-ідэалагічныя, гістарыяграфічна-крыніцазнаўчыя, гісторыка-педагагічныя асновы даследавання эвалюцыі школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі; сканструявана гісторыка-педагагічня мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай

імперыі ў XIX – пачатку XX ст.; выяўлена эвалюцыя канцэптуальна-ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі і поглядах педагогаў наконт выхаваўчай ролі гісторыі ў фарміраванні асноў нацыянальнай самасвядомасці вучняў; вызначаны асаблівасці дыдактычнага канструявання структуры вучэбных тэкстаў і эвалюцыя вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі ў зместавым напаўненні школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбных праграм. Ахарактарызаваны навукова-педагагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі і вучэбна-метадычныя аспекты, звязаныя з яе выкарыстаннем у адукацыйным працэсе ў беларускіх губернях Расійскай імперыі.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону.**

**1.** *Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання* з’яўляюцца вызначальнымі для комплекснага вывучэння эвалюцыі стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў яе гістарычнай рэтраспектыве.

Дзяржаўна-ідэалагічныя асновы даследавання арыентаваны на ўлік канкрэтных дзяржаўна-палітычных фактараў, якія ўплывалі на працэс стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ва ўзаемаабумоўленасці з фарміраваннем грамадзянскасці, патрыятызму, гістарычнай памяці і нацыянальнай самасвядомасці ў вучняў. Вырашэнне праблемы стварэння якасных падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з’яўляецца арганічным кампанентам сучаснай дзяржаўнай гістарычнай палітыкі.

Гістарыяграфічна-крыніцазнаўчыя асновы даследавання звязаны з класіфікацыяй дакументальна-архіўных крыніц, якія сведчылі аб стане развіцця гістарычнай навукі ў XIX – пачатку XX ст. і былі прызначаны для рэгулявання дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да ідэалагічнай і выхаваўчай накіраванасці гістарычнай адукацыі.

Гісторыка-педагагічныя асновы даследавання ўлічваюць канкрэтныя сацыякультурныя, уласна адукацыйныя, навукова-педагагічныя і вучэбна-метадычныя аспекты, прызначаныя для дыдактычнага канструявання вучэбных тэкстаў з мэтай арганізацыі засваення зместу вучэбнага матэрыялу, вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў і рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу вучэбнай літаратуры.

**2.** *Гісторыка-педагагічная мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.* уключае ў сябе канцэптуальна-ідэалагічны, структурна-зместавы, навукова-метадычны кампаненты. Канцэптуаль-

на-ідэалагічны кампанент накіраваны на выяўленне эвалюцыі канцэптуальных ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі з улікам вывучэння поглядаў прадстаўнікоў навукова-педагагічнай супольнасці наконт ролі школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі ў фарміраванні асноў нацыянальнай самасвядомасці вучняў – ураджэнцаў Беларусі. Структурна-зместавы кампанент прадугледжвае вызначэнне асаблівасцей дыдактычнага канструявання структуры і зместу школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі, што выявілася ў фарміраванні вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі. Навукова-метадычны кампанент прадугледжвае характарыстыку навукова-педагагічных асноў стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі і вучэбна-метадычных аспектаў яе выкарыстання ў адукацыйным працэсе беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. Спраектаваная гісторыка-педагагічная мадэль з'яўляецца педагагічным інструментам гісторыка-педагагічнага аналізу падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў з мэтай іх комплекснага вывучэння для сістэмнага разумення эвалюцыйнага развіцця, удасканалення сучасных падручнікаў па айчыннай гісторыі, павышэння эфектыўнасці выкарыстання вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў адукацыйным працэсе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

**3.** *Эвалюцыя канцэптуальна-ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі* ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі сутнасна адбывалася пры рэалізацыі наступных канцэптуальных кірункаў:

– канцэпцыі, звязаныя з дзяржаўнай палітыкай, вызначаныя абавязковымі да выкарыстання ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі, якія адмаўлялі гістарычную і дзяржаваўтваральную суб'ектнасць беларускага народа (палоналітвінізм, ці польскі, літвінізм, балцкі, ці літоўскі, літвінізм, русінацэнтрызм, тэорыя афіцыйнай народнасці, заходнерусізм);

– канцэпцыі, якія не адмаўлялі і адначасова не сцвярджалі існаванне ўласна беларускай гістарычнай і дзяржаваўтваральнай суб'ектнасці (тэорыя краёвасці ў перыяд з 1905 па 1917 г., якая вызначала суб'ектнасць усяго народа Беларуска-Літоўскага краю);

– канцэпцыі, звязаныя з беларускацэнтрычным разуменнем гісторыі (уніяцкі русінацэнтрызм, усходнеславянскі, ці беларускі, літвінізм, заходнерускі беларусізм, ідэя беларускай нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, беларуская нацыянальная ідэя, афармленне гістарычнай і дзяржаваўтваральнай суб'ектнасці беларусаў, афармленне канцэпцыі нацыянальнай гісторыі Беларусі).

Эвалюцыя дзяржаўна-ідэалагічных асноў стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі мае наступныя этапы:

1803–1833 гг.: афіцыйны дазвол паланізацыі і паланафільства ў дачыненні да школьнай гістарычнай адукацыі;

1833–1864 гг.: афіцыйная забарона паланізацыі і паланафільства, рэалізацыя дзяржаўнай ідэалогіі «Праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць» ва ўмовах пашырэння тэорыі афіцыйнай народнасці;

1864–1884 гг.: «оффиціально-охранительный», які характарызуецца стварэннем шэрагу спецыяльных заканадаўчых актаў, накіраваных на дэпаланізацыю адукацыі ў беларускіх губернях;

1884–1917 гг.: узмацненне ідэалагічнай накіраванасці дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ва ўмовах афармлення ідэі замацавання вялікарускай самасвядомасці на аснове канцэпцыі заходнерусізму.

Адным з апасродкаваных фактараў эвалюцыйнага ўплыву на канцэптуалізацыю ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі сталі погляды прадстаўнікоў навукова-педагагічнага супольніцтва Расійскай імперыі, якія мелі несістэмны характар і тычыліся ролі вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў фарміраванні асноў нацыянальнай самасвядомасці вучняў – ураджэнцаў Беларусі. Такія погляды эвалюцыянавалі згодна з гісторыка-ідэалагічнымі канцэпцыямі ў рэчышчы польскай, расійскай, уласна беларускай (ад лакальна-тэрытарыяльных да нацыянальна-культурных маркераў) самасвядомасці. Педагогамі было заўважана, што гісторыя падтрымлівае ды ўмацоўвае ў самасвядомасці чалавека ўласцівую яму любоў да Радзімы, распаўсюджвае гэта пачуццё на ўвесь народ, збліжае яго сучаснае з мінулым, аднаўляе сувязь продкаў з нашчадкамі, а ўсведамленне прыналежнасці да свайго народа праз педагагічны ўплыў гістарычнай адукацыі павінна быць асновай патрыятычнага выхавання.

**4.** *Асаблівасці дыдактычнага канструявання структуры вучэбных тэкстаў школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.* заключаюцца ў тым, што, па-першае, структура вучэбных тэкстаў прадугледжвала асноўны, дадатковы, тлумачальны кампаненты, якія складаліся з апарату арганізацыі засваення зместу і апарату арыенціроўкі; па-другое, структура ўключала ў сябе рубрыкацыю, ілюстратыўную нагляднасць, картаграфічныя матэрыялы, бібліяграфічныя і біяграфічныя ўказальнікі, слоўнікі; па-трэцяе, вучэбныя тэксты ўяўлялі сабой апісанні, апавяданні, разважанні, пададзеныя па індуктыўным ці дэдуктыўным алгарытме як спосабах аўтарскага выкладу зместу.

Эвалюцыя зместу школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку

XX ст. была звязана з фарміраваннем вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі. Фарміраванне такіх вобразаў эвалюцыйна прайшло этапы польскацэнтрычнага і балцкацэнтрычнага разумення, русінацэнтрычнага, ці масквацэнтрычнага, і расійскацэнтрычнага «оффиціально-охранительнаго» асвятлення, а потым полацкацэнтрычнага і наваградскацэнтрычнага, ці беларускацэнтрычнага, прадстаўлення зместу вучэбнага матэрыялу. Вобразы гістарычнага мінулага ў падручніках, дазволеных Вучоным камітэтам Міністэрства народнай асветы Расійскай імперыі, грунтаваліся на тэорыі афіцыйнай народнасці, а потым на канцэпцыі заходнерусізму і пераважна адпавядалі тагачасным праграмна-метадычным указанням у дачыненні да адлюстравання гісторыі Беларусі як састаўной часткі агульнарускай гісторыі як роднай для вучняў.

На аснове аналізу зместу вучэбных праграм, якія паўплывалі на канструяванне зместу школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі, вызначаны ўласна гістарычныя крытэрыі (адлюстраванне вытокаў і паходжання беларускага этнасу, прызнанне яго гістарычнай і дзяржаваўтваральнай суб'ектнасці, адпаведнасць існуючым дзяржаўна-ідэалагічным канцэпцыям, нацыянальная самаідэнтычнасць аўтараў). Выяўлены асаблівасці вучэбных праграм: 1) вучэбныя праграмы (1803–1833) канцэптуальна мелі спачатку польскацэнтрычную і балцкацэнтрычную накіраванасць, паралельна былі падрыхтаваны агульнарасійскія вучэбныя праграмы, якія мелі масквацэнтрычны характар, а вучэбныя праграмы Віленскай вучэбнай акругі належалі да мясцова-патрыятычнай русінацэнтрычнай арыентацыі; 2) вучэбныя праграмы (1833–1917) былі створаны на аснове тэорыі афіцыйнай народнасці і заходнерусізму. У вучэбных праграмах гэтага перыяду адлюстраваны пачатак фарміравання беларускацэнтрычнага (полацкацэнтрычнага і наваградскацэнтрычнага) прадстаўлення зместу вучэбнага матэрыялу, што спрыяла фарміраванню вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі.

**5.** *Навукова-педагагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі* былі звязаны з дыдактычным канструяваннем вучэбнага матэрыялу на аснове рэалізацыі такіх прынцыпаў адбору зместу вучэбнага матэрыялу, як навуковасць, сістэматычнасць, выхаваўчая накіраванасць, нагляднасць, свядомасць і актыўнасць вучняў у працэсе навучання, даступнасць.

*Вучэбна-метадычныя аспекты выкарыстання школьнай вучэбнай літаратуры ў адукацыйным працэсе ў беларускіх губернях Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.* былі звязаны з метадычным апаратам падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі. Яго асаблівасцямі з'яўлялася арыентацыя на механічнае па памяці аднаўленне зместу

вучэбнага матэрыялу, і яно мела пераважна рэпрадуктыўны характар, што прадвызначалася апісальнасцю саміх вучэбных тэкстаў. Большасць падручнікаў садзейнічала фарміраванню ў вучняў поўнага, храналагічна і лагічна паслядоўнага даступнага ўяўлення аб айчыннай гісторыі. З дапамогай падручніка вучні мелі магчымасць засвоіць асноўны матэрыял па айчыннай гісторыі, навучыцца працаваць з тэкстам, ілюстрацыйным апаратам, а таксама асвоіць навыкі працы з апаратам арыенціроўкі.

Зыходзячы з праведзенага аналізу школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі вывучаемага перыяду, можна канстатаваць, што стварэнне вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі павінна грунтавацца на канцэптуальна-ідэалагічных асновах гісторыі Беларусі, прагрэсіўных поглядах гістарычнай і педагагічнай навукі, адпавядаць выразнай структуры, вобразна адлюстроўваць гістарычнае мінулае краіны.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені.** На аснове аналізу крыніц і сучаснага асэнсавання праблемы захавання гістарычнай памяці і ролі ў гэтым гістарычнай адукацыі аўтарам сканструявана гісторыка-педагагічная мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.; выяўлена эвалюцыя канцэптуальна-ідэалагічных, структурна-зместавых, навукова-метадычных асноў распрацоўкі падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў з вызначэннем уплыву на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці вучняў – ураджэнцаў Беларусі; вызначаны ўласна гістарычныя крытэрыі (этнагенез беларусаў, адпаведнасць існуючым дзяржаўна-ідэалагічным канцэпцыям, нацыянальная самаідэнтычнасць аўтараў вучэбнай літаратуры, вобраз Беларусі і беларуса ў розныя храналагічныя перыяды ў складзе Старажытнай Русі, Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі), а таксама дыдактычныя і інструментальныя крытэрыі канструявання вучэбных тэкстаў для характарыстыкі вучэбна-метадычных падыходаў да стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі.

Практычным увасабленнем вынікаў дысертацыі з’явілася арганізацыя ў 2019 г. музея «Вучэбная кніга ў гісторыі адукацыі» ў дзяржаўнай установе адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» з мэтай далучэння педагагічных работнікаў да вывучэння гісторыка-педагагічнай спадчыны беларускага народа.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў.** Апрабацыя вынікаў даследавання ажыццяўлялася на кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» (г. Мінск, 2018–2022 гг.), на пасяджэнні навуковага сходу прафесарска-выкладчыцкага складу дзяржаўнай установы

адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» (22 лістапада 2022 г.); пры ўдзеле аўтара ў 4 навуковых і навукова-практычных канферэнцыях: Міжнародных педагагічных чытаннях «Бесперапынная адукацыя педагогаў: дасягненні, праблемы, перспектывы» (Мінск, 5 лістапада 2018 г.), рэспубліканскай канферэнцыі «Эфектыўны педагагічны вопыт: ад тэорыі да практыкі» (Мінск, 19 лістапада 2019 г.), Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Бесперапынная адукацыя педагогаў: дасягненні, праблемы, перспектывы» (Мінск, 5 лістапада 2020 г.), Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Бесперапынная адукацыя педагогаў: дасягненні, праблемы, перспектывы» (Мінск, 4 лістапада 2021 г.). Вынікі даследавання апрабаваны ў адукацыйным працэсе ўстаноў дадатковай адукацыі дарослых і ўстаноў вышэйшай адукацыі: дзяржаўнай установе адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі», дзяржаўнай установе адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», установе адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова».

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Вынікі і высновы, атрыманыя ў ходзе даследавання, адлюстраваны ў 14 навуковых публікацыях: 10 – у рэцэнзаваных часопісах і зборніках навуковых прац, рэкамендаваных Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь для публікацый навуковых палажэнняў па дысертацыйных даследаваннях; 4 артыкулы — у матэрыялах навуковых і навукова-практычных канферэнцый. Агульны аб'ём публікацый – 10,6 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Структура дысертацыі абумоўлена логікай выкладу матэрыялу і складаецца з наступных раздзелаў: уводзіны, агульная характарыстыка работы, чатыры главы, заключэнне, бібліяграфічны спіс (274 назвы, у тым ліку 260 выкарыстаных крыніц і 14 аўтарскіх публікацый) і дадаткі. Агульны аб'ём дысертацыі складае 425 старонак, з якіх асноўны тэкст займае 115 старонак, спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры – 20 старонак, дадаткі – 290 старонак.

## АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

У першай главе «Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання эвалюцыі школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.» сутнасна раскрыты дзяржаўна-ідэалагічныя, гістарыяграфічна-крыніцазнаўчыя, гісторыка-педагагічныя асновы даследавання эвалюцыі школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі. Выяўлены перыяды гісторыка-педагагічных даследаванняў: дарэвалюцыйны (1803–1917), паслярэвалюцыйны (1917–1991), сучасны

(1991–2022). У дарэвалюцыйным перыядзе склаліся два напрамкі: урадавы напрамак, што стаяў на пазіцыях «официально-охранительной» ідэалогіі і абгрунтоўваў дзяржаўную адукацыйную палітыку Расійскай імперыі на тэрыторыі Беларусі (І.М. Бароздзін, М.Ф. Бунакоў, А.В. Бялецкі, І.Д. Бяляеў, М.І. Дзямкоў, І.П. Карнілаў, Р.Я. Кіпрыяновіч, У.Ф. Крачкоўскі, А.У. Крукоўскі, А.Ф. Маслоўскі, А.І. Мілавідаў, А.Л. Пагодзін, А.П. Сапуноў), і нацыянальны напрамак, што даследаваў культурна-педагагічную спадчыну Беларусі і быў накіраваны на распрацоўку асноў нацыянальнай сістэмы адукацыі (А. Багдановіч, Я. Колас, Я. Купала, Ф. Кудрынскі, В. Ластоўскі). Працы паслярэвалюцыйнага перыяду вызначаліся дамінаваннем марксісцка-ленінскай метадалогіі ў падыходах і ацэнках педагагічных працэсаў. Вылучаюцца 1920, 1960 і 1980-я гг. як дзесяцігоддзі адноснай свабоды творчасці, вынікам чаго стала стварэнне прац, якія і сёння не страцілі сваёй значнасці. У 1930–1950-я гг. па беларускай гісторыка-педагагічнай тэматыцы былі абаронены толькі дзве дысертацыі (А.Т. Абрамовіч, М.К. Кірылаў). У 1960–1980-я гг. адбылося ажыўленне ў навуцы (А.І. Краўцова, М.С. Мяцельскі, З.А. Пастухова, А.В. Трухан), выйшлі першыя абагульняючыя працы па гісторыі адукацыі Беларусі (У.К. Андрэенка, Л.П. Бушчык, Ш.І. Ганелін, Э.Д. Дняпроў, Ф.Ф. Каралёў, М.А. Лазарук, В.У. Мялешка, Д.М. Нікіфараў, У.С. Пасэ, Ф.Р. Паначын, В.Н. Перцаў, А.І. Піскуноў, А.А. Сакольчык, Г.Р. Сянькевіч, М.А. Ткачоў, С.А. Умрэйка, Б.К. Цебіеў, В.А. Цяплова). Сучасны перыяд актуалізаваў праблемы нацыянальнай адукацыі і выхавання. Пашырэнне аб’ектнай сферы гісторыка-педагагічных даследаванняў абумовіла прыцягненне навукоўцамі новых крыніц і метадалогіі. Адбываецца станаўленне падыходу, арыентаванага на нацыянальныя ідэалы і каштоўнасці ў пераасэнсаванні папярэдніх сістэм адукацыі. Адзначаецца павышаны інтарэс да адукацыйнай палітыкі ў Беларусі дарэвалюцыйнага часу ў шэрагу даследаванняў, праведзеных на мяжы XX і XXI стст. (Е.Г. Андрэева, В.С. Болбас, Э.К. Дарашэвіч, Е.Л. Еўдакімава, В.А. Капранава, В.М. Лухверчык, В.У. Ляхоўскі, М.С. Мяцельскі, С.В. Паноў, С.В. Снапкоўская, П.С. Сонцаў, Т.Г. Шацюк).

Для нашага даследавання зроблена класіфікацыя дакументальна-архіўных крыніц, якія ўяўляюць сабой сукупнасць гісторыка-педагагічных дакументаў і вучэбных выданняў, што былі распрацаваны навукоўцамі Расійскай імперыі для арганізацыйнага і вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу «начальныхъ і среднiхъ учѣбных завѣденій Западныхъ губѣрній». Першая група ўключае афіцыйныя дакументы, прызначаныя для рэгулявання дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да ідэалагічнай і выхаваўчай накіраванасці гістарычнай адукацыі: заканадаўчыя

пастановы і рашэнні ўрада, міністэрскія распараджэнні і прадпісанні, загады папячыцеляў вучэбных акруг. Другая група ўключае праграмна-метадычныя выданні: вучэбныя праграмы з тлумачальнымі запіскамі; а таксама школьную вучэбную літаратуру па гісторыі Беларусі, прызначаную для беларускіх губерняў: падручнікі і вучэбныя дапаможнікі. Трэцяя група ўключае рэцэнзіі Вучонага камітэта Міністэрства народнай асветы Расійскай імперыі на школьную вучэбную літаратуру па гісторыі Беларусі і метадычныя выданні з рэкамендацыямі педагагічнага супольніцтва ў дачыненні да стварэння і эфектыўнага выкарыстання падручніка гісторыі.

Для даследавання абраны наступныя метады: агульнанавуковыя – аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя, інтэрпрэтацыя, кантэнт-аналіз; спецыяльна-гістарычныя – параўнальна-гістарычны, храналагічны, праблемна-храналагічны, дыяхронны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны, рэтраспектыўны. Зроблена ўдакладненне і канкрэтызацыя адмысловай гісторыка-педагагічнай тэрміналогіі: паняццяў «эвалюцыя», «вобраз гістарычнага мінулага Беларусі», «школьная вучэбная літаратура па гісторыі Беларусі», «гісторыя Беларусі», «нацыянальная самасвядомасць вучняў – ураджэнцаў Беларусі» адносна XIX – пачатку XX ст.

Грунтуючыся на дзяржаўна-ідэалагічных, гістарыяграфічна-крыніцазнаўчых, гісторыка-педагагічных асновах даследавання і дыдактычных патрабаваннях (крытэрыі і паказчыкі), якія з’яўляюцца абавязковымі ўмовамі да арганізацыі структуры і зместавага напаўнення вучэбных тэкстаў, сканструявана гісторыка-педагагічная мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

Гісторыка-педагагічная мадэль па сваёй структуры ўключае ў сябе канцэптуальна-ідэалагічны, структурна-зместавы і навукова-метадычны кампаненты, вызначаныя як неабходныя асновы для стварэння падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Канцэптуальна-ідэалагічны кампанент мадэлі ўлічвае вынікі ўрадавай палітыкі ў галіне гістарычнай адукацыі ў беларускіх губернях Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.; структурна-зместавы кампанент – дыдактычныя асновы канструявання структурнай арганізацыі і зместавага напаўнення школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў беларускіх губернях Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.; навукова-метадычны кампанент мадэлі ўключае навукова-педагагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі і вучэбна-метадычныя аспекты яе выкарыстання ў адукацыйным працэсе ў беларускіх губернях Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

Табліца – Гісторыка-педагагічная мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

**Канцэптуальна-ідэалагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.**

Эвалюцыя канцэптуальна-ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі ў беларускіх губернях у XIX – пачатку XX ст.

Эвалюцыя поглядаў прадстаўнікоў навукова-педагагічнага супольніцтва Расійскай імперыі наконт выхаваўчай ролі вучэбнай літаратуры па гісторыі ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці вучняў – ураджэнцаў Беларусі.

**Структурна-зместавыя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.**

Асаблівасці дыдактычнага канструявання структуры вучэбных тэкстаў школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

Эвалюцыя вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі ў зместавым напаўненні школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі і вучэбных праграм для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

**Навукова-метадычныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.**

Навукова-педагагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі для навучальных устаноў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

Вучэбна-метадычныя аспекты выкарыстання школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі ў адукацыйным працэсе беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

**Гісторыка-педагагічная ўзаемаабумоўленасць канцэптуальна-ідэалагічнага, структурна-зместавага, навукова-метадычнага кампанентаў у працэсе стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў беларускіх губернях Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.**

Распрацаваная мадэль грунтуецца на гісторыка-педагагічнай узаемаабумоўленасці канцэптуальна-ідэалагічнага, структурна-зместавага, навукова-метадычнага кампанентаў у працэсе стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў беларускіх губернях Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. Дадзеная мадэль з’яўляецца педагагічным інструментам для аналізу школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі з мэтай павышэння эфектыўнасці яе выкарыстання ў адукацыйным працэсе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

У другой главе **«Канцэптуальна-ідэалагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.»** выяўлена эвалюцыя канцэптуальна-ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі ў адпаведнасці з міністэрскімі патрабаваннямі і поглядамі педагогаў наконт выхаваўчай ролі школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў фарміраванні асноў нацыянальнай самасвядомасці вучняў. Вызначаны і сутнасна ахарактарызаваны этапы канцэптуалізацыі ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі.

Расійскі афіцыйна-ўрадавы канцэптуальны кірунак быў звязаны з дзяржаўнай палітыкай, у межах якой адмаўляліся гістарычнасць і дзяржаваўтваральная суб’ектнасць беларускага народа. У яго межах выразна вызначаюцца абавязковыя да выкарыстання канцэпцыі: тэорыя афіцыйнай народнасці (з 1833 па 1864 г.) і заходнерусізм (з 1864 па 1917 г.). Вучоны камітэт Міністэрства народнай асветы Расійскай імперыі патрабаваў строгай адпаведнасці зместу падручнікаў міністэрскай вучэбнай праграме, якая адпавядала гісторыка-ідэалагічнаму кірунку «возвращенія Западной Россіи къ первоначальному своему Русскому типу»: Паўночна-Заходні край = Западная Русь = Западная Россія = неад’емная частка адзінай Вялікай Расіі.

Канцэптуальны кірунак, які быў звязаны з тэорыяй краёвасці (з 1905 па 1917 г.), не адмаўляў суб’ектнасць усяго народа Беларуска-Літоўскага краю і адначасова не сцвярджаў існаванне ўласна беларускай гістарычнай і дзяржаваўтваральнай суб’ектнасці.

Беларускі нацыянальны канцэптуальны кірунак быў звязаны з беларусканцэнтрычным разуменнем айчыннай гісторыі і рэалізаваўся ў працэсе накаплення гістарычных звестак па гісторыі Беларусі і фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. У яго межах асабліва вызначаюцца заходнерускі полацкацэнтрычны і наваградскацэнтрычны беларусізм (у перыяд з 1848 па 1864 г.) і беларуская нацыянальная ідэя (у перыяд з 1884 па 1910 г.), афармленне канцэпцыі нацыянальнай гісторыі Беларусі (у перыяд з 1910 па 1917 г.).

Прадстаўлены практыка-арыентаваныя погляды прадстаўнікоў педагагічнага супольніцтва Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. (С.С. Увараў, К. Бідэрман, В.І. Вадавозаў, А. Каліноўскі, Я.Ц. Міхайлоўскі, М.І. Сухамлінаў, М. Радзевіч, Э. Мішо, Я.Я. Гурэвіч, А.Д. Вейсман, Е.І. Стратонаў, С.Ф. Знаменскі, М. Чэхаў, Е.А. Звягінцаў, У.Ф. Дзінзэ, У. Валжанін), якія тычыліся выхаваўчай ролі школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў фарміраванні асноў нацыянальнай самасвядомасці вучняў – ураджэнцаў Беларусі. Сутнасць такіх поглядаў заключалася ў наступных уяўленнях: гістарычнае навучанне валодае вялікай педагагічнай каштоўнасцю і мае вучэбна-выхаваўчы патэнцыял, які павінен быць накіраваны на якаснае вырашэнне адукацыйных задач; настаўнік павінен развіваць выхаваўчую дзейнасць, якая вынікае з яго адукацыйнай працы, і ўлічваць, што «исторія обязана не только образовывать, но и воспитывать»; выкладанне гісторыі патрабуе выкарыстання ў адукацыйным працэсе якасных падручнікаў, якія павінны адпавядаць дыдактычным патрабаванням.

У трэцяй главе «**Структурна-зместавыя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.**» вызначаны асаблівасці дыдактычнага канструявання структуры вучэбных тэкстаў і эвалюцыя вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі ў зместавым напаўненні школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбных праграм. Дыдактычнае канструяванне структуры школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі «Заходняй Русі» ўлічвала патрабаванні педагагічнай навукі да вучэбнай літаратуры: індуктыўны і дэдуктыўны алгарытмы прадстаўлення і засваення зместу вучэбнага матэрыялу; апарат арганізацыі засваення; ілюстрацыйны матэрыял; картаграфічны матэрыял; апарат арыенціроўкі. Асабліва істотнае значэнне надавалася ўводнаму тэксту, які павінен быў дапамагаць вучням хутка арыентавацца ў падручніку і ў далейшым выкарыстоўваць увесь яго патэнцыял. У большасці падручнікаў уводны тэкст уключаў правілы і прыёмы працы з падручнікам, а таксама даваў адказ на пытанне «Для чаго мы вывучаем гісторыю?». Заключны тэкст пераважна быў прадстаўлены кароткім аглядам гістарычнага развіцця і дапамагаў вучням усвядоміць значнасць вывучэння айчыннай гісторыі. Тлумачальны тэкст уключаў у сябе слоўнік гістарычных тэрмінаў і паняццяў, а таксама подпісы да карт і ілюстрацый. Дадатковы тэкст быў прадстаўлены цытаваннем выразаў гісторыкаў старажытнасці, а таксама ўстаўкамі ўрыўкаў мастацкага тэксту і гістарычных дакументаў.

Аналіз зместавага напаўнення на аснове распрацаваных аўтарам параметраў (крытэрыі і паказчыкі) дазволіў выявіць вобраз гістарычнага

мінулага Беларусі ва ўсе перыяды развіцця дзяржаўнасці на беларускіх землях, сутнасць якога эвалюцыйна змяняецца ад польскацэнтрычнага, балцкацэнтрычнага, расійскацэнтрычнага (масквацэнтрычнага) у іх сукупнасці да беларускацэнтрычнага (полацкацэнтрычнага і наваградскацэнтрычнага) разумення. Варта адзначыць, што, разглядаючы гісторыю Беларусі з пазіцый «заходнерусізму», расійскія дарэвалюцыйныя вучоныя ўжо прызнавалі ролю беларускіх зямель ва ўтварэнні і развіцці Вялікага Княства Літоўскага. Пачаткам фарміравання беларускацэнтрычнага вобраза Радзімы стала асэнсаванне гісторыкамі-заходнерусістамі ідэі аб вытоках беларускай дзяржаўнасці. Першая беларускацэнтрычная гісторыя Беларусі была створана С. Шыпавым (1848) і В. Турчыновічам (1854): Вялікае Княства Літоўскае = Вялікае Княства Беларускае. Імі былі сфарміраваны полацкацэнтрычная і наваградскацэнтрычная канцэпцыі, якія далей сталі асновай беларускай нацыянальна арыентаванай гістарыяграфіі і тлумачылі, што вытокі беларускай дзяржаўнасці ў Полацкай Русі і ў Вялікім Княстве Літоўскім. Упершыню быў зроблены сістэмны выклад беларускага гістарычнага мінулага як асобнага суб'екта гістарычнага працэсу.

У чацвёртай главе «**Навукова-метадычныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.**» канкрэтызаваны навукова-педагагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі і вучэбна-метадычныя аспекты, звязаныя з яе выкарыстаннем у адукацыйным працэсе ў беларускіх губернях Расійскай імперыі. Асновай выкладання гісторыі ў навучальных установах беларускіх губерняў Расійскай імперыі сталі падручнікі, вучэбныя дапаможнікі і створаныя пераважна беларускімі педагогамі-гісторыкамі навучальныя матэрыялы па гісторыі роднага краю. Прааналізаваны міністэрскія рэцэнзіі на тагачасныя падручнікі па гісторыі Беларусі і вызначана навуковае стаўленне Вучонага камітэта Міністэрства народнай асветы Расійскай імперыі да іх выкарыстання ў адукацыйным працэсе. Аналіз рэцэнзій паказаў пераважна станоўчае стаўленне да структуры і зместу падручнікаў Вучонага камітэта, які вызначыў іх прыдатнымі да выкарыстання. Выяўлены рэкамендацыі прадстаўнікоў педагагічнай супольнасці Расійскай імперыі па выкарыстанні падручнікаў у адукацыйным працэсе. На ўроку і ў працэсе выканання дамашніх заданняў вядучая роля заставалася за падручнікам. Паводле метадычных рэкамендацый, кожны падручнік павінен задавальняць двум асноўным патрабаванням: «онъ долженъ давать доброкачественный въ научномъ отношеніи матеріалъ и быть пригоднымъ для той школы, для которой его выбираютъ». Правільна выкарыстоўваючы падручнік, і настаўнік, і вучні маглі эфектыўна пабудаваць сваю

адукацыйную дзейнасць. Апарат арыенціроўкі дапамагаў вучням паўней авалодаць ведамі па гісторыі і найбольш эфектыўна выкарыстоўваць падручнік у працэсе навучання. Ілюстрацыі дапамагалі вобразна засвоіць матэрыял, развіваць мысленне вучняў. Ілюстрацыйны матэрыял часткова замяняў тэкст і выконваў функцыю абслугоўвання тэксту. З дапамогай карт вучні мелі магчымасць добра засвоіць геаграфічнае становішча «Заходняй Русі», напрамкі славянскай каланізацыі і прасачыць ход войнаў. Карты, прадстаўленыя ў параграфах, маглі выкарыстоўвацца пры працы і з іншымі тэмамі, бо давалі шырокае кола інфармацыі для разважання на ўроку падчас абагульнення ўжо вядомай і новай інфармацыі. Вучні мелі магчымасць працаваць з картамі як на ўроку, так і дома. У шэрагу падручнікаў ілюстрацыйны апарат быў складзены такім чынам, што на яго аснове вучні маглі самастойна разважаць, рабіць высновы і адказваць на пытанні.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

**1.** *Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання* з'яўляюцца вызначальнымі для комплекснага вывучэння эвалюцыі школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў яе гістарычнай рэтраспектыве.

Дзяржаўна-ідэалагічныя асновы даследавання арыентаваны на ўлік канкрэтных дзяржаўна-палітычных фактараў (умацаванне нацыянальнай і інфармацыйнай бяспекі, забеспячэнне ўстойлівага развіцця беларускага грамадства), якія ўплываюць на працэс стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ва ўзаемаабумоўленасці з фарміраваннем грамадзянскасці, патрыятызму, гістарычнай памяці і нацыянальнай самасвядомасці ў вучняў. Вырашэнне праблемы стварэння якасных падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца арганічным кампанентам сучаснай дзяржаўнай гістарычнай палітыкі.

Гістарыяграфічна-крыніцазнаўчыя асновы даследавання звязаны з класіфікацыяй дакументальна-архіўных крыніц, якія сведчылі аб стане развіцця гістарычнай навукі ў XIX – пачатку XX ст. і былі прызначаны для рэгулявання дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да ідэалагічнай і выхаваўчай накіраванасці гістарычнай адукацыі.

Гісторыка-педагагічныя асновы даследавання ўлічваюць канкрэтныя сацыякультурныя, уласна адукацыйныя, навукова-педагагічныя, вучэбна-метадычныя аспекты дыдактычнага канструявання вучэбных тэкстаў і звязаны з аналізам вучэбных праграм і 28 вучэбных выданняў па гісторыі Беларусі, якія ў сваёй большасці маюць афіцыйны міністэрскі грыф,

а таксама праграмна-метадычных выданняў, што былі распрацаваны навукоўцамі Расійскай імперыі для арганізацыйнага і вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу «начальныхъ і среднíхъ учѣбных завѣденій Западныхъ губѣрній».

Вобраз гістарычнага мінулага Беларусі вызначаецца як прадстаўленая ў гістарычнай рэтраспектыве рэальнасць, якая ўключае ў сябе верыфікаваныя ў пэўнай дзяржаўна-ідэалагічнай інтэрпрэтацыі сістэмы навуковых уяўленняў аўтараў школьных вучэбных праграм і вучэбнай літаратуры аб гістарычным мінулым краіны і народа з прызнаннем або адмаўленнем дзяржаваўтваральнай і гістарычнай суб'ектнасці беларусаў як нацыі.

Школьная вучэбная літаратура па гісторыі Беларусі вызначаецца як комплекс сродкаў навучання (вучэбныя праграмы, падручнікі і вучэбныя дапаможнікі для вучняў, вучэбна-метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў), прызначаных для вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу «начальныхъ і среднíхъ учѣбных завѣденій Западныхъ губѣрній».

Пад нацыянальнай самасвядомасцю вучняў – ураджэнцаў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. як суб'ектаў навучання і выхавання ў канкрэтных дзяржаўна-палітычных і сацыяльна-культурных умовах разумеецца ўсведамленне сваёй прыналежнасці да беларускай нацыі, веданне яе асаблівасцей і агульных рыс з вялікарускім этнасам, прыняцце сістэмы традыцыйных каштоўнасцей беларускага народа як перакананняў пры ацэнцы гістарычных падзей і асоб [6–8-А; 14-А].

**2.** *Гісторыка-педагагічная мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.* уключае ў сябе канцэптуальна-ідэалагічны, структурна-зместавы, навукова-метадычны кампаненты. Канцэптуальна-ідэалагічны кампанент дазволіў прасачыць эвалюцыю канцэптуальных ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі ад тэорыі афіцыйнай народнасці да канцэпцыі заходнерусізму з улікам вывучэння поглядаў прадстаўнікоў навукова-педагагічнай супольнасці наконт ролі школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі ў фарміраванні асноў нацыянальнай самасвядомасці вучняў – ураджэнцаў Беларусі. Структурна-зместавы кампанент дазволіў вызначыць асаблівасці дыдактычнага канструявання структуры і зместу школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі, што выявілася ў фарміраванні вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі ад польска- і балцкацэнтрычных да масква- і русінацэнтрычных з арыентацыяй на захаванне мясцова-патрыятычнай пазіцыі. Навукова-метадычны кампанент дазволіў вызначыць навукова-педагагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі і вучэбна-метадычныя аспекты яе выкарыстання ў адукацыйным працэсе

беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. Спраектаваная гісторыка-педагагічная мадэль з'яўляецца педагагічным інструментам гісторыка-педагагічнага аналізу падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў з мэтай іх комплекснага вывучэння для сістэмнага разумення эвалюцыйнага развіцця, удасканалення сучасных падручнікаў па айчыннай гісторыі, павышэння эфектыўнасці выкарыстання вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў адукацыйным працэсе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі [1–3-А; 6–9-А; 14-А].

**3.** *Канцэптуалізацыя дзяржаўна-ідэалагічных асноў стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі* ў працэсе сваёй рэалізацыі ў беларускіх губернях адбывалася ў рэчышчы дзяржаўнай палітыкі расійскага ўрада ў галіне гістарычнай адукацыі. Так афіцыйная дзяржаўная канцэпцыя заходнерусізму ўплывала на фарміраванне агульнадзяржаўнай расійскай самасвядомасці грамадзяніна Расійскай імперыі і перашкаджала фарміраванню беларускай нацыянальнай самасвядомасці вучняў – ураджэнцаў Беларусі. Беларускацэнтрычная канцэпцыя, якой прытрымлівалася частка прадстаўнікоў навукова-педагагічнага супольніцтва – аўтары школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі, спрыяла фарміраванню беларускай нацыянальнай самасвядомасці, але ў рэгіянальных рамках агульнадзяржаўнай расійскай самасвядомасці.

Працэс стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі адбываўся ў своеасаблівых дзяржаўна-ідэалагічных умовах, якія характарызаваліся як польскім у перыяд з 1803 па 1833 г., так і расійскім з 1833 па 1917 г. ідэалагічнымі ўплывамі.

Эвалюцыя ў канцэптуалізацыі ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі мела наступныя этапы:

1803–1833 гг.: рэалізацыя палітыкі паланізацыі і паланафільства, калі адукацыйны працэс грунтаваўся на нарматыўных прававых актах часоў дзейнасці Адукацыйнай камісіі;

1833–1864 гг.: рэалізацыя дзяржаўнай ідэалогіі «Праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць» ва ўмовах пашырэння тэорыі афіцыйнай народнасці;

1864–1884 гг.: «оффиціально-охранительный», накіраваны на дэпаланізацыю адукацыі на аснове канцэпцыі заходнерусізму і ўзмацненне русіфікацыйнай накіраванасці асветы з непрызнаннем самастойнасці беларускага этнасу, яго культуры, мовы і права на стварэнне нацыянальнай школы;

1884–1917 гг.: афармленне ідэі замацавання вялікарускай самасвядомасці на аснове канцэпцыі заходнерусізму з адначасовым станаўленнем беларускай нацыянальнай ідэі.

Дзяржаўна-ідэалагічныя асновы гісторыі Беларусі вызначаліся ў адпаведнасці з патрабаваннямі Міністэрства народнай асветы Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. у кантэксце рэалізацыі трох канцэптуальных кірункаў. Расійскі афіцыйна-ўрадавы канцэптуальны кірунак быў звязаны з дзяржаўнай палітыкай, у межах якой адмаўляліся гістарычная і дзяржаваўтваральная суб'ектнасць беларускага народа (недзяржаўныя і дазволеныя да выкарыстання канцэпцыі польскага і балцкага літвінізму, русінацэнтрызм, дзяржаўныя тэорыя афіцыйнай народнасці і канцэпцыя заходнерусізму). Канцэптуальны кірунак, які не адмаўляў і адначасова не сцвярджаў існаванне ўласна беларускай гістарычнай і дзяржаваўтваральнай суб'ектнасці (тэорыя краёвасці). Беларускі нацыянальны канцэптуальны кірунак быў звязаны з беларускацэнтрычным разуменнем айчыннай гісторыі (уніяцкі русінацэнтрызм, усходнеславянскі літвінізм, заходнерускі полацкацэнтрычны і наваградскацэнтрычны беларусізм, беларуская нацыянальная ідэя).

На канцэптуалізацыю дзяржаўна-ідэалагічных асноў стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі паўплывалі погляды прадстаўнікоў навукова-педагагічнага супольніцтва Расійскай імперыі. Такія погляды пры іх несістэмным характары сведчылі аб пэўнай ролі школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў фарміраванні асноў нацыянальнай самасвядомасці вучняў – ураджэнцаў Беларусі. Сутнасць поглядаў дзяржаўных аўтараў-заходнерусістаў заключалася як у монацэнтрычным характары (яны прытрымліваліся афіцыйнай пазіцыі згодна з дзяржаўнай палітыкай у галіне школьнай гістарычнай адукацыі), так і ў дваістым характары (з аднаго боку, яны прытрымліваліся афіцыйнай пазіцыі згодна з дзяржаўнай палітыкай у галіне школьнай гістарычнай адукацыі, а з другога боку, імкнуліся праз дыдактычнае канструяванне зместу вучэбнага матэрыялу і засваенне яго вучнямі паўплываць на іх адносіны да канцэптуальнага ўсведамлення айчыннай гісторыі). Педагогамі была заўважана пэўная педагагічная ўзаемасувязь паміж гістарычнай адукацыяй і фарміраваннем нацыянальнай самасвядомасці, гістарычнай памяці, гістарычнага мыслення, перакананняў, жыццёвай пазіцыі; гісторыя падтрымлівае ды ўмацоўвае ў самасвядомасці чалавека ўласцівую яму любоў да Радзімы і распаўсюджвае гэта пачуццё на ўвесь народ, зближае яго сучаснае з мінулым, аднаўляе сувязь продкаў з нашчадкамі [1–3-А; 7–9-А; 11-А].

**4.** *Асаблівасці дыдактычнага канструявання структуры вучэбных тэкстаў школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.* заключаюцца ў тым, што, па-першае, структура вучэбных тэкстаў прадугледжва-

ла асноўны, дадатковы, тлумачальны кампаненты, якія складаліся з апарату арганізацыі засваення зместу і апарату арыенціроўкі; па-другое, структура ўключала ў сябе рубрыкацыю, ілюстратыўную нагляднасць, картаграфічныя матэрыялы, бібліяграфічныя і біяграфічныя ўказальнікі, слоўнікі; па-трэцяе, вучэбныя тэксты ўяўлялі сабой апісанні, апавяданні, разважанні, пададзеныя па індуктыўным ці дэдуктыўным алгарытме як спосабах аўтарскага выкладу зместу.

Усе прааналізаваныя вучэбныя выданні адпавядаюць прынцыпам навуковасці, выхаваўчай накіраванасці, даступнасці. Аднак толькі асобныя адпавядаюць прынцыпам сістэматычнасці, нагляднасці, прынцыпу свядомага і актыўнага ўдзелу вучняў у працэсе навучання (якасць метадычнага апарату) – гэта падручнікі С. Шыпава, В. Ластоўскага і А. Турцэвіча. Патрабаванням да дыдактычнага канструявання структуры вучэбнага выдання ў пэўнай ступені адпавядаюць толькі падручнікі С. Шыпава «Взглядъ на исторію Западной Руси», П. Бранцава «Очеркъ древнѣй Литвы и Западной Россіи», А. Турцэвіча «Русская исторія (въ связи съ исторіей великаго княжества Литовскаго)», «Краткій учебникъ русской исторіи», В. Ластоўскага «Кароткая гісторыя Беларусі», Р. Паўскага «Краткая исторія Западно-Русскаго края», У. Ангельскага «Историческая памятка западноруссу».

Асаблівасці эвалюцыі зместу школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. у адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбных праграм тычацца характарыстыкі вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі з пункту гледжання дзяржаваўтваральнай і гістарычнай суб’ектнасці беларусаў у перыяды Старажытнай Русі, Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі. Кампанент накіраваны на выяўленне ў кожным з перыядаў этнічнай прыналежнасці дзяржаўнага ўтварэння – свая ўласная для беларускага народа або чужая дзяржава; вызначэнне форм стварэння дзяржаў, у склад якіх увайшлі беларускія землі: заваяванне, падпарадкаванне, анэксія, акупацыя, інкарпарацыя, адарванне, аддзяленне, злучэнне, прылучэнне, гвалтоўны саюз, дабравольны раўнапраўны саюз, дынастычны саюз, асіміляцыйнае пераўтварэнне, аб’яднанне, уз’яднанне, вызваленне, зліццё.

Креставае напаўненне школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі, дазволенай Вучоным камітэтам Міністэрства народнай асветы для вучняў беларускіх губерняў, пераважна адпавядае тагачасным гісторыка-ідэалагічным і праграмна-метадычным указанням у дачыненні да адлюстравання гісторыі Беларусі як роднай для вучняў. Першая група вучэбных праграм, якія з дазволу расійскай улады дзейнічалі ў перыяд

1803–1833 гг., канцэптуальна мела спачатку польскацэнтрычную і балцкацэнтрычную накіраванасць (праграмы Адукацыйнай камісіі), паралельна падрыхтаваныя агульнарасійскія вучэбныя праграмы мелі масквацэнтрычны характар, а вучэбныя праграмы Віленскай вучэбнай акругі належалі да мясцова-патрыятычнай русінацэнтрычнай арыентацыі. Другая група вучэбных праграм, якія дзейнічалі ў перыяд 1833–1917 гг., была створана на аснове тэорыі афіцыйнай народнасці і заходнерусізму [1–5-А; 12-А].

**5.** *Навукова-педагагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі* былі звязаны з дыдактычным канструяваннем вучэбнага матэрыялу ў падручніках (вучэбных дапаможніках) на аснове рэалізацыі такіх прынцыпаў адбору зместу вучэбнага матэрыялу, як навуковасць, сістэматычнасць, выхаваўчая накіраванасць, нагляднасць, свядомы і актыўны ўдзел вучняў у працэсе навучання, даступнасць (адэкватнасць маўленчага афармлення тэксту падручнікаў часу іх стварэння), і ўлічвалі патрабаванні педагагічнай навукі да структуры вучэбных тэкстаў.

У першай палове XIX ст. умовы мэтазгоднага складання вучэбнай літаратуры па гісторыі не былі выразна вызначанымі. Нават найбольш распаўсюджаная і лепшая вучэбная літаратура характарызавалася адсутнасцю адзінства ў разуменні мэты навучання, і немагчыма было адназначна вызначыць, чым яна з’яўляецца па змесце і па выкладзе: «не то самоучителями, не то пособіями для ученика и для учителя». Дыдактычныя крытэрыі для канструявання падручнікаў былі вызначаны на рубяжы XIX–XX стст. Большасць вучэбных выданняў адпавядала прынцыпам сістэматычнасці, нагляднасці, даступнасці. Асновай выкладання гісторыі роднага краю ў школах Беларусі з’яўляліся падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, створаныя пераважна беларускімі педагогамі-гісторыкамі. Структура і іх змест у асноўным адпавядалі навуковым патрабаванням і вызначаліся Вучоным камітэтам Міністэрства народнай асветы Расійскай імперыі прыдатнымі да выкарыстання. Патрабаванні ўключалі ў сябе наступныя кампаненты: адпаведнасць высновам тагачаснай гістарычнай навукі; план падручніка, выбар і размеркаванне матэрыялу, асвятленне найважнейшых бакоў гістарычнага працэсу і асноўных гістарычных фактараў, усебаковае асвятленне матэрыяльнай і духоўнай культуры, дзяржаўнага і грамадскага ладу, гаспадаркі, эканамічных, палітычных і сацыяльных адносін, рэлігіі, асветы, біяграфій; адсутнасць тэндэнцыйнасці ў падборы фактаў, архаізмаў, памылак ці скажэння фактаў, буйных пропускаў, цяжка зразумелых выразаў; вылучэнне на першы план самага галоўнага і падкрэсліванне галоўнай думкі; паліграфічныя якасці падручніка, яго аб’ём.

*Вучэбна-метадычныя аспекты выкарыстання школьнай вучэбнай літаратуры ў адукацыйным працэсе ў беларускіх губернях Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.* былі звязаны з метадычным апаратам падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі. Яго асаблівасцямі з'яўлялася арыентацыя на механічнае па памяці аднаўленне зместу вучэбнага матэрыялу, і яно мела пераважна рэпрадуктыўны характар, што прадвызначалася апісальнасцю саміх вучэбных тэкстаў. Большасць падручнікаў садзейнічала фарміраванню ў вучняў поўнага, храналагічна і лагічна паслядоўнага даступнага ўяўлення аб айчыннай гісторыі. З дапамогай падручніка вучні мелі магчымасць засвоіць асноўны матэрыял па айчыннай гісторыі, навучыцца працаваць з тэкстам, ілюстрацыйным апаратам, асвоіць навыкі працы з апаратам арыенціроўкі.

Пераважная большасць педагогаў меркавала, што падручнік (вучэбны дапаможнік) з'яўляецца неабходным і абавязковым сродкам для падрыхтоўкі да вучэбных заняткаў і паўтарэння зместу вывучанага вучэбнага матэрыялу. Частка педагогаў лічыла, што выкладанне настаўніка павінна быць асновай навучання, а падручнік можна выкарыстоўваць неабавязкова і толькі як дапаможны сродак. Рэкамендацыі прадстаўнікоў педагагічнай супольнасці Расійскай імперыі былі разнапланавымі і нават супрацьлеглымі па сваім праграмна-метадычным і дыдактычным характары, але ўсе яны па сваёй мэце былі накіраваны на выпрацоўванне навукова-педагагічных падыходаў да павышэння якасці выкарыстання настаўнікам і вучнямі вучэбных кніг па гісторыі ў адукацыйным працэсе [1–3-А; 6-А; 10-А; 13-А].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны для навукова-метадычнага забеспячэння працэсу стварэння сучаснай школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў Рэспубліцы Беларусь, вывучэння гісторыі педагагічнай думкі і гістарычнай адукацыі; павышэння кваліфікацыі і падрыхтоўкі настаўнікаў гісторыі; сістэмнага афармлення музейных экспазіцый, прысвечаных вучэбнаму кнігавыданню па гісторыі; распрацоўкі на аснове дзяржаўнай ідэалогіі навукова-педагагічнага механізма фарміравання, захавання і ўмацавання грамадзянскасці, патрыятызму, гістарычнай памяці і нацыянальнай самасвядомасці беларускіх вучняў на сучасным этапе развіцця краіны. Атрыманыя вынікі даследавання з'яўляюцца актуальнымі для сучаснага стану і перспектыў развіцця вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ
# САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ


## Артыкулы ў навуковых рэцэнзаваных часопісах, рэкамендаваных Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь

1-А. Бітчанка, С. М. Канцэптуальныя асновы інтэрпрэтацыі гісторыі Беларусі і дзяржаўная палітыка Расійскай імперыі ў галіне гістарычнай адукацыі ў другой і трэцяй чвэрцях XIX стагоддзя / С. М. Бітчанка // Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя Е. Педагагічныя навукі. – № 15 (лістапад). – Полацк : ПДУ, 2020. – С. 2–10.

2-А. Бітчанка, С. М. Гісторыка-ідэалагічныя канцэпцыі гісторыі Беларусі і ўрадавая адукацыйная палітыка Расійскай імперыі ў апошняй чвэрці XVIII – першай чвэрці XIX ст. / С. М. Бітчанка // Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя Е. Педагагічныя навукі. – № 7 (май). – Полацк : ПДУ, 2021. – С. 7 – 13.

3-А. Бітчанка, С. М. Дзяржаўная палітыка Расійскай імперыі ў дачыненні да ідэалагічнай накіраванасці гістарычнай адукацыі Беларусі ў апошняй чвэрці XIX – першай чвэрці XX ст. / С. М. Бітчанка // Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя Е. Педагагічныя навукі. – № 15 (лістапад). – Полацк : ПДУ, 2021. – С. 2 – 11.

## Артыкулы ў зборніках навуковых прац, рэкамендаваных Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь

4-А. Битченко, С. М. Образ Беларуси во взглядах Игнатия Кулаковского на преподавание истории в учебных заведениях Северо-Западного края Российской империи / С. М. Битченко // Сборник научных трудов Академии последипломного образования. – Выпуск 15 / редколлегия : А.П. Монастырный (гл. ред.) [и др.] ; ГУО «Академия последипломного образования». – Минск : АПО, 2017. – С. 41–52.

5-А. Бітчанка, С. М. Вобраз гістарычнага мінулага Беларусі ў вучэбнай кнізе Арсенія Турцэвіча «Кароткі падручнік рускай гісторыі» (на ўзроўні пачатковай адукацыі) / С. М. Бітчанка // Зборнік навуковых прац Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Вып. 17 / рэдкал. : А. П. Манастырны (гал. рэд.) [і інш.] ; ДУА «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі». – Мінск : АПА, 2019. – С. 18–34.

6-А. Бітчанка, С. М. Праблема эфектыўнасці выкарыстання падручніка пры выкладанні гісторыі ў рэкамендацыях педагогаў Расійскай імперыі канца XIX – пачатку XX ст. (на ўзроўнях пачатковай і сярэдняй адукацыі) / С. М. Бітчанка // Зборнік навуковых прац Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Вып. 17 / рэдкал. : А. П. Манастырны (гал. рэд.) [і інш.] ;

ДУА «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі». – Мінск : АПА, 2019. – С. 35–49.

7-А. Бітчанка, С. М. Вучэбна-выхаваўчы характар гістарычнай адукацыі ва ўяўленнях прадстаўнікоў педагагічнай навукі Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. / С. М. Бітчанка // Зборнік навуковых прац Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Вып. 18 / рэдкал. : А. П. Манастырны (гал. рэд.) [і інш.] ; ДУА «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі». – Мінск : АПА, 2020. – С. 32–45.

8-А. Бітчанка, С. М. Педагагічная сувязь гістарычнай адукацыі і выхавання нацыянальнай самасвядомасці ва ўяўленнях навукоўцаў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. / С. М. Бітчанка // Зборнік навуковых прац Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Вып. 18 / рэдкал. : А. П. Манастырны (гал. рэд.) [і інш.] ; ДУА «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі». – Мінск : АПА, 2020. – С. 29–42.

9-А. Бітчанка, С. М. Выхаваўчае значэнне школьнай гістарычнай адукацыі ў дачыненні да развіцця асобы вучняў / С. М. Бітчанка // Зборнік навуковых прац Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Вып. 21 / рэдкал. : А. П. Манастырны (гал. рэд.) [і інш.] ; ДУА «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі». – Мінск : АПА, 2021. – С. 49–66.

10-А. Бітчанка, С. М. Патрабаванні да вучэбна-гістарычнай літаратуры ў рэцэнзіях Міністэрства народнай асветы Расійскай імперыі / С. М. Бітчанка // Зборнік навуковых прац Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Вып. 21 / рэдкал. : А. П. Манастырны (гал. рэд.) [і інш.] ; ДУА «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі». – Мінск : АПА, 2021. – С. 67–83.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

11-А. Бітчанка, С. М. Роля гістарычнай адукацыі ў фарміраванні і ўмацаванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў // Международные педагогические чтения «Непрерывное образование педагогов: достижения, проблемы, перспективы» (Минск, 5 ноября 2018 г.) [Электронный ресурс] / М-во образования Респ. Беларусь, ГУО «Акад. последиплом. образования», ОО «Белорус. пед. о-во». – Минск : АПО, 2018. – С. 30–34.

12-А. Бітчанка, С. М. Прынцыпы арганізацыі вучэбнага матэрыялу пры стварэнні падручнікаў гісторыі для ўстаноў пачатковай і сярэдняй адукацыі Расійскай імперыі ў канцы XIX – пачатку XX ст. // Республиканская конференция «Эффективный педагогический опыт: от теории к практике» (Минск, 19 ноября 2019 г.) [Электронный ресурс] / М-во образования Респ. Беларусь, ГУО «Акад. последиплом. образования», ОО «Белорус. пед. о-во». – Минск : АПО, 2019. – С. 109–118.

13-А. Бітчанка, С. М. На шляху да бесперапыннай адукацыі педагогаў: арганізацыя прафесійнай падрыхтоўкі настаўнікаў у Расійскай імперыі ў другой палове XIX стагоддзя // Международная научно-практическая конференция «Непрерывное образование педагогов: достижения, проблемы, перспективы» (Минск, 5 ноября 2020 г.) [Электронный ресурс] / М-во образования Респ. Беларусь, ГУО «Акад. последиплом. образования», ОО «Белорус. пед. о-во». – Минск : АПО, 2020. – С. 79–86.

14-А. Бітчанка, С.М. Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання эвалюцыі вучэбнай літаратуры Расійскай імперыі па гісторыі Беларусі // Международная научно-практическая конференция «Непрерывное образование педагогов: достижения, проблемы, перспективы» (Минск, 4 ноября 2021 г.) [Электронный ресурс] / М-во образования Респ. Беларусь, ГУО «Акад. последиплом. образования», ОО «Белорус. пед. о-во». – Минск : АПО, 2021. – С. 109–115.

## РЭЗЮМЭ

Бітчанка Сяргей Міхайлавіч

**Эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.**

**Ключавыя словы**: гістарычная адукацыя, XIX – пачатак XX ст., беларускія губерні Расійскай імперыі, дзяржаўная адукацыйная палітыка, школьная вучэбная літаратура, гісторыя Беларусі.

**Мэта даследавання**: выяўленне гісторыка-педагагічнай эвалюцыі школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

**Метады даследавання**: агульнанавуковыя – аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя, інтэрпрэтацыя, кантэнт-аналіз; спецыяльна-гістарычныя – параўнальна-гістарычны, храналагічны, праблемна-храналагічны, дыяхронны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны, рэтраспектыўны.

**Атрыманыя вынікі і іх навуковая навізна:** сканструявана гісторыка-педагагічня мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.; выяўлена эвалюцыя ў канцэптуалізацыі ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне гістарычнай адукацыі і ў адпаведнасці з поглядамі педагогаў наконт выхаваўчай ролі гісторыі ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці вучняў; вызначаны асаблівасці дыдактычнага канструявання вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбных праграм. Ахарактарызаваны навукова-педагагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры і вучэбна-метадычныя аспекты, звязаныя з яе ўжываннем у адукацыйным працэсе.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** навукова-метадычнае забеспячэнне стварэння сучаснай школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі; сістэмнае афармленне музейных экспазіцый, прысвечаных вучэбнаму кнігавыданню па гісторыі; рэалізацыя функцыі выхавання грамадзянскасці, патрыятызму, гістарычнай памяці і нацыянальнай самасвядомасці беларускіх вучняў сярэдняй агульнаадукацыйнай школы.

**Галіна выкарыстання**: гісторыя педагагічнай думкі і адукацыі ў Беларусі; дзяржаўная адукацыйная палітыка; стварэнне школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі; тэорыя і методыка навучання гісторыі; прафесійная падрыхтоўка, павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка настаўнікаў гісторыі.

## РЕЗЮМЕ

Битченко Сергей Михайлович

**Эволюция создания школьной учебной литературы по истории Беларуси в Российской империи в XIX – начале XX в.**

**Ключевые слова:** историческое образование, XIX – начало XX в., белорусские губернии Российской империи, государственная образовательная политика, школьная учебная литература, история Беларуси.

**Цель исследования:** выявление историко-педагогической эволюции школьной учебной литературы по истории Беларуси для учащихся белорусских губерний Российской империи в XIX – начале XX в.

**Методы исследования**: общенаучные – анализ, синтез, индукция, дедукция, интерпретация, контент-анализ; специально-исторические – сравнительно-исторический, хронологический, проблемно-хронологический, диахронный, историко-типологический, историко-системный, ретроспективный.

**Полученные результаты и их научная новизна:** сконструирована историко-педагогическая модель создания школьной учебной литературы по истории Беларуси для белорусских губерний Российской империи в XIX – начале XX в.; выявлена эволюция в концептуализации идеологических основ истории Беларуси в условиях государственной политики Российской империи в области исторического образования и в соответствии со взглядами педагогов о воспитательной роли истории в формировании национального самосознания учащихся; определены особенности дидактического конструирования образов исторического прошлого Беларуси в соответствии с требованиями учебных программ. Охарактеризованы научно-педагогические основы создания школьной учебной литературы и учебно-методические аспекты, связанные с ее применением в образовательном процессе.

**Рекомендации по использованию:** научно-методическое обеспечение создания современной школьной учебной литературы по истории Беларуси; системное оформление музейных экспозиций, посвященных учебному книгоизданию по истории; реализация функции воспитания гражданственности, патриотизма, исторической памяти и национального самосознания белорусских учащихся средней общеобразовательной школы.

**Область применения:** история педагогической мысли и образования в Беларуси; государственная образовательная политика; создание школьной учебной литературы по истории Беларуси; теория и методика обучения истории; профессиональная подготовка, повышение квалификации и переподготовка учителей истории.

## RESUME

Siarhei Bitchanka

### The evolution of the creation of school textbooks on the history of Belarus in the Russian Empire in the XIX-early XX centuries

**Key words:** historical education, 19th – early 20th centuries, Belarusian provinces of the Russian Empire, state educational policy, school textbooks, history of Belarus.

**The purpose of the study:** to identify the historical and pedagogical evolution of school textbooks on the history of Belarus for students in the Belarusian provinces of the Russian Empire in the 19th - early 20th centuries.

**Research methods:** general scientific – analysis, synthesis, induction, deduction, interpretation, content analysis; special-historical – comparative-historical, chronological, problem-chronological, diachronic, historical-typological, historical-systemic, retrospective.

**The results obtained and their scientific novelty:** a historical and pedagogical model for creating school textbooks on the history of Belarus for the Belarusian provinces of the Russian Empire in the 19th – early 20th centuries was constructed; the evolution in the conceptualization of the ideological foundations of the history of Belarus in the conditions of the state policy of the Russian Empire in the field of historical education and in accordance with the views of teachers on the educational role of history in the formation of the national consciousness of students was revealed; the features of the didactic images of the historical past of Belarus were determined in accordance with the requirements of the curricula. The scientific and pedagogical foundations for the creation of school educational literature and the educational and methodological aspects associated with its use in the educational process are characterized.

**Recommendations for use:** scientific and methodological support for the creation of modern school educational literature on the national history of Belarus, the systematic design of museum expositions dedicated to educational book publishing on history; implementation of the function of educating citizenship, patriotism, historical memory and national self-consciousness of Belarusian secondary school students.

**Scope of application:** history of pedagogical thought and education in Belarus; state educational policy; creation of school textbooks on the history of Belarus; theory and methodology of teaching history; professional training, advanced training and retraining of history teachers.



Падпісана да друку 17.05.2023. Фармат 60×84/16. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 1,63. Ул.-выд. арк. 1,7. Тыраж 60 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай
рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага
дзяржаўнага ўніверсітэта». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/63 ад 10.09.2018.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск